Урок беларускай мовы ў 6 класе па тэме

“Правапіс не (ня) з прыметнікамі”

**Тэма:** Правапіс не (ня) з прыметнікамі

**Мэта:** стварэнне ўмоў для засваення ведаў, уменняў і навыкаў па тэме “Правапіс не (ня) з прыметнікамі”.

**Задачы:** дапамагчы вучням засвоіць правіла напісання не (ня) з прыметнікамі; выпрацоўваць уменні прымяняць неабходны алгарытм разважання, адрозніваць прыметнікі, якія без не (ня) не ўжываюцца, падбіраць да прыметнікаў сінонімы ці блізкія па значэнні словы, улічваць наяўнасць у сказах супрацьпастаўлення ці слоў далёка не, зусім не; правільна ўжываць прыметнікі з не (ня) у вусным і пісьмовым маўленні; узбагачаць слоўнікавы запас вучняў; развіваць мысленне, памяць і творчыя здольнасці вучняў; выхоўваць цікавасць да беларускай мовы.

**Тып урока:** камбінаваны ўрок.

**Абсталяванне:** падручнік, карткі-заданні, сшыткі-дапаможнікі.

**Ход урока**

**I. Арганізацыйны момант. Эмацыянальны настрой на ўрок**

*Вясна пяе, і свішча, і шчабеча,* -
*На паплавах, на нівах, у лясах,* -
*І ўсюды просьба чутна: “Чалавеча!*
*Пачуй сябе ў шчаслівых галасах!”*

*Ніл Гілевіч*

Добры дзень, дарагія сябры! Рада вас вітаць на сённяшнім уроку. На вуліцы вясна. Спадзяюся, што ў вас добры настрой. І з гэтым добрым настроем давайце з задавальненнем будзем сёння працаваць.

**II. Праверка дамашняга задання**

1. *Выбарачная праверка дамашняга задання*
2. *Работа ля дошкі*

(Ля дошкі працуюць 3 вучні, астатнія працуюць з заданнем у сшытках).

***Заданне.*** *У сказах, запісаных на дошцы, раскрыць дужкі, падкрэсліць граматычную аснову, растлумачыць правапіс прыметнікаў, даць характарыстыку прыметніку (на выбар).*

1. Паўднёва(заходні) вецер гнаў сіне(зялёныя) хвалі горка(салёнага) акіяна.
2. Хаваўся ў хмары месяц (крута)рогі.
3. На Беларусі нярэдка бывалі (трыццаці)градусныя маразы.

**III. Падрыхтоўка да ўспрымання новай тэмы праз актуалізацыю ведаў**

1. *Арфаграфічная хвілінка: правапіс не (ня), ні з назоўнікамі.*

Небарака, непрыяцель, нянавісць, ні канца ні краю, не мора, а рака, не сусед, непарадак, нястача, непагадзь, няпраўда, не пракосы, а палосы, невук, ні рыба ні мяса.

2. Карыстаючыся апорнай схемай “Правапіс назоўнікаў з не (ня), ні” растлумачце правапіс назоўнікаў, запісаных на дошцы.

**Правапіс назоўнікаў з не (ня), ні**




4. *Гутарка з класам*

- Чаму мы звярнуліся да правапісу не (ня) з назоўнікамі?
- Вы ўжо здагадаліся, якую тэму мы будзем вывучаць сёння на ўроку?

**IV. Мэтавызначэнне**

*Словы настаўніка*

Сёння мы з вамі будзем разглядаць правапіс часціц не (ня) з прыметнікамі. Давайце сфармулюем мэту нашага ўрока. Вы ўжо ведаеце, што мэта павінна існаваць. Як карабель мае пэўны кірунак свайго плавання, так і чалавек павінен ставіць перад сабой мэты і дасягаць іх. Калі не ведаеш,

куды ідзеш, невядома, куды трапіш. (Сёння я павінен даведацца… навучыцца…)

<u>*Адказы вучняў. Падагульненне настаўніка*</u>

**V. Знаёмства з новай тэмай**

<u>*Работа з падручнікам*</u>

1. Работа ў парах: аналіз схемы практыкавання 225.

- Якія пункты правіла напісання не (ня) з прыметнікамі з’яўляюцца аднолькавымі і для назоўніка?
- Што характэрна толькі для прыметніка?

2. Практыкаванне 224 (вусна). Пасля выканання вучні фармулююць правіла правапісу не (ня) з прыметнікамі.

3. Састаўленне апорнай схемы па тэме ўрока (матэрыял дапаўняецца).




**VI. Фізкультхвілінка**

**VII. Замацаванне ведаў і уменняў**

<u>*1. Работа ў парах (картка 1)*</u>

*Спішыце, раскрываючы дужкі. Вызначце ўмовы напісання не (ня) з прыметнікамі, карыстаючыся апорнай схемай.*

(Не, ня)хворы, а здаровы; (не, ня)высокі чалавек; (не, ня)дужэйшы за брата; (не, ня)сцерпны боль; зусім (не, ня)дарагі касцюм; (не, ня)цёмны, а светлы; зусім (не, ня)блізкі шлях; нічуць (не, ня)цяжкая задача; (не, ня)парушны спакой; (не, ня)меншым поспехам.

<u>*2. Работа ля дошкі і ў сшытках*</u>

*Запісаць сказы, растлумачыць правапіс не (ня) з прыметнікамі.*

1.Усхліпваюць у чаротах неспакойныя хвалі шырокай Прыпяці.

2. Лёгкая хмурынка праплыла па небе неабсяжным.

3. Хутка машына пад'ехала да невялікай вёсцы.

*3. Гульня "Карэктар". Знайдзіце і выпраўце памылкі ў напісанні слоў.*

Не цікавая кніга; зусім не спакойнае дзіця; нядобры ўчынак; гадзіннік незалаты; не цяжэйшы за камень; не ярка-ружовы; ня добры ўчынак; вельмі неветлівы позірк; не шырокая, а вузкая дарожка.

*4.Самастойная работа (картка 2)*

*Спішыце тэкст, раскрываючы дужкі і выбіраючы адпаведнае напісанне не ці ня з прыметнікамі. Сфармулюйце правіла, якім карысталіся.*

Месца тут (не, ня)роўнае, узгоркавае. Некалі ў дагістарычны перыяд магутная рака намыла гэтыя высокія пясчаныя дзюны, на якіх разумныя людзі пасадзілі (не, ня)вялікі лес. Потым ён разросся. На грэбнях узгоркаў цяпер раслі адны сосны, зусім (не, ня)старыя, роўныя, высокія, чыстыя, адна ў адну (Паводле І. Шамякіна).

*5.Праверачная тэставая работа (картка 3)*

*Не, (ня) пішацца разам (1) ці асобна (2)? Пастаўце ў дужках адпаведную лічбу.*

а) зусім …далёкая дарога;

б) …высокі ўраджай;

в) сонечны, але …яркі дзень;

г) далёка …ветлівы чалавек;

д) мёд …ліпавы.

**VIII. Падвядзенне вынікаў урока**

Выстаўленне і каменціраванне адзнак

**IX. Дамашняе заданне**

п. 42 (апорная схема), напісаць міні-сачыненне "Вясновая раніца" з выкарыстаннем прыметнікаў з не (ня).

**X. Рэфлексія**

Метад «Букет настрою».